*Літаратура*

*1. Шамякін, І. Зб. тв.: У 23 тт. Т 22. – Мінск: Маст. літ., 2014.*

*2. Колас, Якуб. Зб. тв.: У 20 тт. Т 18. – Мінск: Беларус. навука, 2012.*

*3. Колас, Якуб. Зб. тв.: У 20 тт. Т 19. – Мінск: Беларус. навука, 2012.*

*4. Колас, Якуб. Зб. тв.: У 20 тт. Т 20. – Мінск: Беларус. навука, 2012.*

*5. Архіў Акадэміі навук Беларусі. – Ф. 7, воп. 4, спр. 2858.*

*6. Глебка, П. Зб. тв.: У 4 тт. – Т. 4. – Мінск: Маст. літ., 1986.*

*7. Шамякін, І. Зб. тв.: У 23 тт. Т 21. – Мінск: Маст. літ., 2014.*

***Валерый Белакурскі***
***Жанна Белакурская***

## Філасофска-культуралагічныя кантэксты творчасці Якуба Коласа

Творчасць Якуба Коласа належыць да таго напрамку айчыннай літаратуры, прыкметай якой выступае арганічная роднасць з філасофска-светапогляднымі ідэаламі свайго часу. Як сапраўдны мастак слова, Якуб Колас увайшоў у літаратуру са сваім філасофскім поглядам на чалавека і грамадства, гісторыю і прыроду. Думкі пісьменніка прабіваюцца ад індывідуальнага да ўніверсальнага, ад асобы да космасу.

Якуб Колас не стварыў цэласнай філасофскай сістэмы, ды ён і не ставіў перад сабой такой задачы. Аднак пісьменнік пакінуў у сваіх творах экзістэнцыяльны тэкст быцця творчай асобы ў трагічнай гісторыі беларускага грамадства, унікальны ўзор філасофствавання. Для таго каб вызначыць, у чым іменна выражаецца філасафічнасць творчасці Якуба Коласа, неабходна ўдакладніць значэнне канцэптаў «філасофская проза», «філасофская паэзія». На наш погляд, для філасофскай прозы і філасофскай паэзіі як асобных жанраў літаратуры характэрны шэраг канкрэтных прыкмет. Галоўная – гэта пастаноўка тых

праблем існага, якія з'яўляюцца менавіта філасофскімі пытаннямі: «Што я магу ведаць?», «Што я павінен рабіць?», «На што я магу спадзявацца?», «Што такое чалавек?» (І. Кант).

Якуб Колас дае на іх адказ, па-мастацку спасцігаючы свет з дапамогай сваіх ведаў, экзістэнцыяльнага вопыту, паэтычнай інтуіцыі [VIII, 289]. Мастацкі геній тут дазваляе яму стаць на адзін узровень з такімі велічынямі, як Амар Хаям, Ф. М. Дастаеўскі, Л. М. Талстой, якія імкнуліся ў сваёй творчасці да філасофскага асэнсавання чалавека і сусвету.

Хаця Якуб Колас не пакінуў ніводнага філасофскага трактата, яго мастацкія творы прасякнуты роздумам над філасофскімі пытаннямі, якія тычацца праблем антрапалогіі, этыкі, эстэтыкі, экалогіі і інш. Ва ўсіх гэтых сферах выяўляецца незвычайная канцэнтрацыя коласаўскай думкі, багацце і глыбіня ідэй, што сведчыць пра гарманічнае спалучэнне філасофскага погляду на сусвет, мастацкага таленту і паэтычнай інтуіцыі. Пры гэтым трэба асобна падкрэсліць цеснае перапляценне яго творчага шляху з эпахальнымі і пераломнымі з'явамі беларускай гісторыі, з лёсам народа, з дзейнасцю шэрагу знакамітых прадстаўнікоў айчыннай культуры, навукі, палітыкі.

У прозе і паэтычных творах Якуб Колас па-філасофску асэнсоўвае мноства драматычных момантаў сутыкнення чалавека і сусвету, паказвае яго «хаджэнне па пакутах», пераадольванне сацыяльнага абсурду, напаўненне сэнсам існага, раскрывае станаўленне чалавека як асобы. Менавіта гэта тэма прысутнічае ў большасці твораў пісьменніка [II, 8; V, 459; VI, 33].

Уся творчасць Якуба Коласа, яго публіцыстыка, мастацкія творы, эпісталярная спадчына – гэта ўзор літаратуры, у цэнтры якой – роздум аб лёсе чалавека ў сусвеце, звязаным з рэаліямі яго існасці [IX, 33; IX, 724]. Па сутнасці, усё жыццё мысляра было прысвечана тэме абгрунтавання экзістэнцыяльнай каштоўнасці асобы, яе права на годнае існаванне і ў той жа час абавязку перад агульнай справай людзей [IX 76; XI 11].

Якуб Колас стварае ўласную арыгінальную празаіка-паэтычную канцэпцыю светаразумення, якую рэалізуе ў сваім мастацтве. У гісторыі беларускай літаратуры цяжка

знайсці творцу, мастацтва якога было б у такой ступені абумоўлена ўплывам сацыякультурнага кантэксту. Пры гэтым выяўляецца прынцыповая непадначаленасць пісьменніка якім-небудзь дагматам, паколькі яго светапогляд не выступае часткай якіхсьці ідэйных канструкцый, наадварот, Якуб Колас імкнецца да таго, каб усё інтэлектуальнае багацце грамадства ўвайшло ў яго духоўны свет.

Характэрнай прыкметай філасафічнасці творчасці Якуба Коласа з'яўляецца антынамізм і поліфанізм яго мыслення. Пабудовы яго думкі амаль заўсёды суправаджаюцца калі не рашучым адмаўленнем, то спробай паглядзець на з'яву з розных бакоў [VII 144; X 289]. Такі дыялектычны аналіз процілеглых пачаткаў, праз сутыкненне якіх праяўляецца сапраўдная сутнасць грамадскіх з'яў, адлюстроўваецца Якубам Коласам праз паказ свайго светапогляднага шляху.

Як вядома, сапраўдны талент пісьменніка сведчыць аб сабе не толькі ў мастацкім адлюстраванні існасці, але і ва уменні даць адказ на складаныя пытанні быцця, паказаць індывіду і грамадству выхад з гістарычнага тупіка, а таксама спосаб вырашэння сацыякультурных праблем. Мастацкія і філасофскія вартасці творцы дазваляюць Якубу Коласу ўключыцца у той гістарычны дыялог, які вякамі вядзецца ў хрысціянскай культуры. У аснове светаразумення Якуба Коласа ляжыць вера ў перамогу дабра над ліхам, гэта значыць, вера, якая падштурхоўвае чалавека да перабудовы свету на справядлівых гуманістычных пачатках.

Усёй сваёй творчасцю Якуб Колас пацвярджае філасофскі тэзіс аб гістарычнай бесперспектыўнасці ідэалогіі насілля і, развіваючы далей гуманістычныя прынцыпы сваёй этыкі, абвяшчае маральны характар свайго светаразумення [IX 698; XI 8]. Для Якуба Коласа вышэйшая каштоўнасць антрапалагічна ўласціва любому, нават самаму «маленькаму чалавеку», і ў гэтым заключаецца яго безумоўнае дачыненне да гуманістычнай традыцыі класічнай еўрапейскай і рускай літаратуры (I.В. Гётэ, В. Гюго, А. С. Пушкін, Ф. М. Дастаеўскі). Па сутнасці, ўсе героі твораў Якуба Коласа – гэта самыя звычайныя і бясхітрасныя людзі, якія шукаюць простае

чалавечае шчасце, на шляху здабывання якога стаяць як варожыя асобнаму індывіду стыхіі прыроды, так і намнога больш грозныя сілы грамадства. Пісьменнік імкнецца па-мастацку паказаць існасць сваіх герояў, якія складаюць народ, перад тварам улады і няўмольным ходам гісторыі [IX 79, 596; X 15].

Ужо ў першых літаратурных творах Якуба Коласа ярка выражана імкненне пераадолець аднабаковасць, спасцігнуць схаваныя прычыны канфліктаў асабістага і грамадскага, духоўнага і матэрыяльнага, гістарычных традыцый і побытавых рэалій, абумоўленых асаблівасцямі асобы і грамадства [IX 182; X 20, 309].

Пісьменнік выяўляе ў ходзе Першай сусветнай вайны выспяванне сацыяльнага выбуху, мастацкая інтуіцыя дазваляе яму ўбачыць набліжэнне рэвалюцыі як непазбежнасці гістарычнага развіцця [IV 217, VIII 25, 102; IX 559, 698].

Такім чынам, унікальнасць Якуба Коласа як мастака і мысліцеля заключаецца не толькі ў тым, што ў яго творах узнаўляюцца жыццёвыя рэаліі і сама атмасфера тых эпахальных разломаў, сведкам і ўдзельнікам якіх яму давялося быць, асаблівасцю выступае яшчэ і тое, што цяжка знайсці ў гісторыі беларускай літаратуры творцу, мастацтва якога было б у такой жа ступені насычана гістарычнымі дэталямі, культуралагічнымі фактамі, маральнымі ацэнкамі, мастацкімі сюжэтамі, эстэтычнымі навацыямі і пастаноўкай сацыяльна-значных праблем.

Пры ўсёй несумненнасці таго факта, што Якуб Колас мысліць як мастак, выражаючы сваё непаўторнае разуменне свету ў мастацкіх вобразах, за быццём яго персанажаў і герояў часта хаваюцца «метафізічныя сэнсы», апавяданне яго шматпланавае і насычана мноствам філасофскіх канцэптаў, раскрыццё зместу якіх магчыма толькі з пазіцый адпаведных культурных кодаў-кантэкстаў.

*Літаратура*

*1.Кант, И. Критика чистого разума / И. Кант. – М.: Мысль, 1994. – 591 с.*

*2.Колас, Я. Збор твораў: у 12-ці т. / Я. Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1961–1964.*